УДК 008:325.2(476)«1921/1939»

# КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ЭМІГРАНТАЎ З ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

***Коваль В. У.*** *(г. Мінск)*

Спадчына беларускай дыяспары заслугоўвае глыбокага даследавання гісторыкаў, культуролагаў, мастацтвазнаўцаў, этнографаў, псіхолагаў, лінгвістаў. Асобнай старонкай мінулага беларускага замежжа сталі міжваенныя эміграцыйныя працэсы з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Культурна-асветніцкая дзейнасць беларусаў у розных краінах свету мела свае адметныя рысы. Асаблівае стаўленне да развіцця літаратуры, тэатральнага і музычнага мастацтваў было ў беларусаў, якія жылі ў Латвіі, Літве, Чэхаславакіі.

Аналіз архіўных дакументаў дазваляе зрабіць высновы, што з 1921 па 1939 г. асноўная маса беларускага насельніцтва выехала з тэрыторыі чатырох ваяводстваў Другой Рэчы Паспалітай: Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага. Дакладную колькасць беларускіх эмігрантаў падлічыць складана: афіцыйныя польскія дакументы для эміграцыі не мелі графы «нацыянальнасць». Спецыялісты пагаджаюцца з меркаваннем, што міжваенная беларуская эміграцыйная хваля складала каля 200 тыс. чалавек. Беларускія эмігранты накіроўваліся ў Францыю, Літву, Латвію, Чэхаславакію, Германію, ЗША, Канаду, Аргенціну, Бразілію, Уругвай, Парагвай.

Даследаванне асноўных кірункаў дзейнасці дыяспары дае падставы сцвярджаць, што культурная праца эмігрантаў дапамагала асобам справіцца са стрэсам, выкліканым акультурацыяй, спрыяла індывідуальнай адаптацыі. Пры дапамозе культурных праектаў эмігрантам прасцей было асвоіць нормы паводзін, прынятыя ў грамадстве, для паспяховай камунікацыі з аўтахтонным насельніцтвам. Арганізацыйная работа беларусаў замежжа садзейнічала кансалідацыі дыяспары, дазваляла асобам паступова скарачаць культурную дыстанцыю з дамінуючым этнасам. Дастаткова складана псіхалагічная адаптацыя праходзіла ў эмігрантаў, якія выехалі ў краіны Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі.

Значная культурная дыстанцыя вымушала эмігрантаў мяняць стыль жыцця, рэакцый і паводзін. Прадстаўнікі эканамічнай эміграцыйнай хвалі ў міжваенны перыяд прасцей спраўляліся са складанасцямі першапачатковай адаптацыі ў тым выпадку, калі яны мелі магчымасць наладзіць свой побыт за мяжой і атрымліваць рэгулярныя заробкі. Палітычныя беларускія эмігранты імкнуліся да захавання нацыянальных культурных традыцый у асяродку замежжа, што часам суправаджалася складанымі сітуацыямі ў працэсе іх сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі.

Беларускія паэты і пісьменнікі замежжа з'яўляліся аднымі з асноўных носьбітаў нацыянальнай культуры, іх творы дапамагалі захоўваць калектыўную памяць дыяспары. Асобныя беларускія цэнтры мелі сваіх таленавітых літаратараў. Значная ўвага надавалася маладым аўтарам, аб поспехах якіх перыядычна пісала беларускамоўная прэса. Выбітным аўтарам беларусаў Латвіі быў П. Масальскі, які пачаў пісаць вершы яшчэ ў школьныя гады, калі быў вучнем Люцынскай беларускай гімназіі. Педагогі гімназіі падтрымлівалі і развівалі літаратурны талент, дапамагалі маладому паэту публікаваць свае творы ў перыядычных выданнях Рыгі і за мяжой Латвіі.

П. Масальскі атрымаў педагагічную адукацыю і сам стаў настаўнікам беларускай пачатковай школы ў Дзвінску. Паэт падпісваў свае творы псеўданімамі «Пятро Сакол» і «Пятрусь». На старонках газеты «Сялянская ніва» за 2 кастрычніка 1927 г. сустракаецца літаратурны агляд яго паэзіі: «Творчасьць П. Масальскага, выхаванага на беларускім адраджэнскім руху, яскрава адбівае[ц]ь у сабе чорныя і сьветлыя бакі беларускага адраджэнскага жыцьця ў Латвіі, а таму яна цікава ня толькі для латвійскіх Беларусаў, але і для замежных. Творы яго, – пераважна лірыка, поўная глыбокай шчырасьці і мастацтва» [1]. Багатае і насычанае тэатральнае і музычнае жыццё беларусаў Латвіі спрыяла развіццю талента паэта. Малады аўтар займаўся арганізацыяй літаратурных вечарын у Рызе, на якіх імкнуўся данесці публіцы свае перакананні і пачуцці ў вобразах уласных вершаў.

Інтэлектуальнымі цэнтрамі беларусаў Латвіі сталі педагагічныя калектывы беларускіх школ і гімназій, а таксама студэнцкія аб'яднанні. Выбітныя выкладчыкі працавалі ў Люцынскай і Дзвінскай беларускіх гімназіях. У Рызе дзейнічаў гурток беларускага студэнцтва Мастацкай акадэміі. Гурток актыўна супрацоўнічаў са слухачамі Беларускіх настаўніцкіх курсаў у Рызе. Членаў студэнцкага гуртка і курсаў яднала імкненне да самаадукацыі, моладзь дыяспары вылучалася дынамізмам і ініцыятыўнасцю.

Адметным аўтарам сярод беларусаў Літвы стала студэнтка Л. Раманейка, якая перыядычна выступала ў клубе «Беларуская хатка» [3]. Беларуская моладзь у Коўне стварыла студэнцкае аб'яднанне Універсітэта Вітаўта Вялікага з мэтай развіцця нацыянальнай традыцыі за мяжой, а таксама яе інтэграцыі ў сусветны культурна-асветніцкі прастор.

З асаблівай пашанай да літаратурнай спадчыны ставіліся беларусы Чэхаславакіі. У Празе рэгулярна адзначалі юбілеі беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, звярталіся да творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа ў рамках праграм музычна-літаратурных вечарын.

Варта падкрэсліць, што перажыванні эмігрантаў, звязаныя з настальгіяй, найбольш яскрава перададзены менавіта праз творы літаратуры замежжа. Складанасці сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі, цяжкасці ўзаемадзеяння з этнічнай большасцю насельніцтва краіны-рэцыпіента спрыялі фарміраванню міфічнага вобраза Бацькаўшчыны. Рамантызацыя Радзімы суправаджалася ў асоб тужлівым настроем і развагамі над магчымасцямі рээміграцыі. Эма-

цыйна і глыбока ўнутраны канфлікт эмігранта апісаў У. Жылка ў вершы «На эміграцыі»:

Мне ўсё часцей радзіма сніцца…
Там рух і песні аб вясне,
Там працы творчая крыніца,
Там мо знайшлося б месца мне?

Паэт шчыра і адкрыта апісаў стан асобы ў іншакультурным асяроддзі, які можна ахарактарызаваць прыгнечанасцю і разгубленасцю. Верш заканчваецца апісаннем тыповых праяўленняў рэакцыі акультурацыйнага стрэсу:

І нават месяц бледна срэбны
Смяеецца рогам за акном:
Ты больш нікому не патрэбны,
І сам сабе ты цяжаром!

У. Жылка, які ў 1923 г. паступіў на філалагічнае аддзяленне філасофскага факультэта Карлавага ўніверсітэта, праз вершаванае слова цудоўным чынам перадаў супярэчнасці духоўна-псіхалагічнага і культурнага характару асобы за мяжой сваёй Бацькаўшчыны.

Адным з кірункаў грамадскай дзейнасці культурна-асветніцкіх цэнтраў беларусаў замежжа была арганізацыя дабрачыннай дапамогі хворым, дзецям, малазабяспечаным асобам. У 1920-я гг. у Літве плённа працавала Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа (заснаванае ў 1921 г.). Ініцыятарамі стварэння арганізацыі былі вядомыя грамадскія дзеячы беларускай дыяспары ў Літве. Чырвоны Крыж таксама аказваў дапамогу беларускім эмігрантам у Чэхаславакіі. Значная ўвага надавалася стану здароўя студэнтаў, праводзіліся бясплатныя медыцынскія агляды моладзі, некаторыя студэнты накіроўваліся на лячэнне.

Дзеячы культуры і члены асветніцкіх арганізацый займаліся зборам ахвяраванняў на дабрачыннасць, часам акцыі праводзіліся на тэатральна-музычных вечарынах. Напрыклад, у часопісе «Беларускі студэнт» (№ 2–3 за 1923 г.), які рыхтаваўся да друку ў Празе, арганізацыя фінансавай дапамогі беларускіх эмігрантаў у ЗША апісвалася наступным чынам: «Дзеля просьбы Беларускага Студєнскага Саюза ў Вільні аб матар'яльнай дапамозе Саюзу і ліста Я. Купалы да Чарапука аб цяжкім палажэньні беларускіх вучоных, паєтаў і літєратараў у Радавай Беларусі, а так сама й цяжкога палажєньня беларускае прєсы ў Заходняй Беларусі, арганізаваўся камітэт пад старшынствам Чарапука на збор ахвяр на асноўныя мэты. З паведамленьняў відаць, што ўсе гэтыя справы знайшлі спачуцьцё ў амэрыканскіх Беларусоў, якія ахвотна даюць грошы» [4, арк. 28]. Артыкул пад назвай «Беларусы ў Амерыцы» дэманстраваў сувязь эмігрантаў з метраполіяй, якую развівалі ў першую чаргу дзеячы навукі і культуры. З беларусамі замежжа плённа кантактавалі ў рамках разнастайных праектаў Я. Купала, Я. Колас, У. Пічэта, Я. Карскі.

У Чэхаславакіі склалася традыцыя святкаваць угодкі літаратурна-мастацкай дзейнасці класікаў беларускай літаратуры Я. Коласа і Я. Купалы. Літаратурныя вечарыны выклікалі значную грамадскую цікавасць, яны заўсёды былі даспадобы беларускім студэнтам. Напрыклад, 21 снежня 1927 г. Беларускае культурнае таварыства імя Ф. Скарыны ў Празе святкавала 20-я ўгодкі літаратурна-мастацкай дзейнасці Я. Коласа ў памяшканні «Студэнцкага дома». Прэса намагалася публікаваць матэрыялы аб падобных мерапрыемствах. У аглядзе газеты «Сялянская ніва» падкрэслівалася: «Прысутных было дужа многа, якія з энтузыязмам ухвалілі паслаць ад Скарынінскага Т-ва дарагому юбіляру Я. Коласу на памяць прывітаньне-адрэс. Акадэмія пакінула на ўсіх дужа сымпатычнае ўражэньне, як сьвята выключна культурнае» [5]. Спецыяльна для ўрачыстасці беларускія эмігранты ўпрыгожылі залу «Студэнцкага дома» партрэтам паэта і беларускім сцягам. На вечарыне публіцы прадставілі урыўкі з твораў Я. Коласа, дэкламацыя вершаў дапаўнялася беларускімі песнямі.

Тэатральнае мастацтва ў міжваенны перыяд дазваляла эмігрантам у іншародным грамадстве захоўваць і дэманстраваць нацыянальны лад жыцця, гістарычныя і этнічныя традыцыі, фарміраваць пачуццё нацыянальнага гонару і годнасці. У 1920-я гг. у Латвіі ствараліся аматарскія вандроўныя трупы пад кіраўніцтвам настаўнікаў. У тэатральных пастаноўках прымалі ўдзел выключна артысты-аматары. Асаблівай папулярнасцю карысталіся п'есы В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалы, Ц. Гартнага, У. Галубка, Ф. Аляхновіча. Беларусы Латвіі распачалі традыцыю перад спектаклем арганізоўваюць лекцыю па гісторыі Беларусі.

З 1922 г. пачалі дзейнічаць беларускія гімназіі ў Дзвінску і Люцыне, дзе таксама былі арганізаваны аматарскія творчыя калектывы. На сцэне гімназій у тэатральных пастаноўках настаўнікі ўдзельнічалі разам са сваімі вучнямі. Асабліва папулярнымі сярод гледачоў былі выступленні драматычнага гуртка Дзвінскай беларускай гімназіі, які ўзначальвала таленавітая настаўніца П. В. Мядзёлка. Творчы тэатральны калектыў у Люцынскай гімназіі стварыў настаўнік С. Казека.

Пра запатрабаванасць тэатральных пастановак у Латвіі і папулярнасць драматычнага мастацтва ў асяроддзі дыяспары сведчыць той факт, што ў 1927 г. у Рызе было створана Беларускае тэатральнае таварыства, якое 24 сакавіка 1928 г. заснавала Беларускі народны тэатр [2, с. 119]. На ўрачыстым адкрыцці тэатра ў Рызе адбылася прэм'ера камедыі Я. Купалы «Паўлінка», якую латышскія тэатральныя крытыкі высока ацанілі ў сваіх рэцэнзіях на старонках перыядычных выданняў.

Беларускія эмігранты ў Чэхаславакіі таксама актыўна займаліся развіццём музычнага і тэатральнага мастацтва. У 1923 г. у Празе быў створаны Беларускі студэнцкі хор [4, арк. 15], беларускія пастаноўкі праходзілі на сцэне ўкраінскага аматарскага тэатра ў Юзэфове. Адметнай старонкай беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі стаў удзел эмігрантаў у выставах перыядычных выданняў, якія рэгулярна праводзіліся ў Празе і Брно. Арганізацыяй беларускіх

стэндаў на разнастайных выставах славянскіх часопісаў займаўся загадчык Беларускага замежнага архіва М. Вяршынін пры падтрымцы Беларускай рады ў Празе. Беларускае Скарынаўскае культурнае таварыства рэгулярна праводзіла музычна-літаратурныя вечарыны ў Празе, да якіх актыўна далучалася студэнцкая моладзь.

Захаваннем нацыянальных духоўных каштоўнасцей у Літве займалася Беларускае культурна-асветніцкае таварыства, якое ў 1932 г. у Коўне стварыла клуб «Беларуская хатка». Паспяховым асветніцкім праектам беларусаў Літвы стала арганізацыя ў 1933 г. Беларускага народнага ўніверсітэта, які ўяўляў сабой кароткатэрміновыя курсы для дарослых. Лекцыі па гісторыі, літаратуры, мовазнаўстве, геаграфіі Беларусі ладзіліся не толькі ў Коўне, але і ў іншых населеных пунктах, дзе пражывалі беларусы.

Паспяховыя культурна-асветніцкія праекты былі рэалізаваны таксама беларускімі эмігрантамі ў краінах Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Літаратурна-музычныя вечарыны ў Нью-Ёрку рэгулярна арганізоўваў Жаночы гурток пры Беларускім нацыянальным камітэце [6]. Жанчыны-беларускі ў Аргенціне нярэдка далучаліся да праектаў украінскай дыяспары. Прыкладам культурна-асветніцкай работы эмігрантаў з'яўляецца бібліятэка імя Тараса Шаўчэнкі ў Буэнас-Айрэсе, пры якой з 1938 г. дзейнічала жаночая арганізацыя эмігрантак [8, р. 163]. У памяшканні бібліятэкі жаночая арганізацыя рэгулярна ладзіла вечарыны, у праграме якіх былі нацыянальныя танцы, народныя песні і гульні, а таксама выступленні дзіцячых творчых калектываў.

Шырокую асветніцкую дзейнасць у Аргенціне праводзіла суполка «Беларуская Грамада», якая ў 1936 г. арганізавала таварыства «Культура» [7, с. 194]. Арганізацыя ладзіла тэатральныя вечарыны, якія выклікалі шчырую зацікаўленасць гледачоў. Успаміны беларусаў Аргенціны сведчаць, што беларускамоўныя спектаклі ў Буэнас-Айрэсе дапамагалі эмігрантам адчуць сувязь з метраполіяй, атрымаць пазітыўныя эмоцыі, якія спрыялі іх псіхалагічнай адаптацыі.

Такім чынам, культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх эмігрантаў спрыяла развіццю міждзяржаўных культурных кантактаў, стварала новую канцэпцыю нацыянальнай культуры ў асяроддзі замежжа ў міжваенны перыяд, захоўвала гістарычную памяць народа. Беларускія эмігранты плённа развівалі мастацкую літаратуру, музычную культуру, тэатральнае мастацтва. Для развіцця культурнага патэнцыялу дыяспары ствараліся бібліятэкі, аматарскія тэатральныя і музычныя калектывы, эмігранты займаліся арганізацыяй праграм дадатковай адукацыі дарослых.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. К. Пяцігодзьдзе літэратурнай працы П. Сакала / К. // Сялян. ніва. – 1933. – № 80. – С. 3.

2. Кастусёнак. Беларускі Народны Тэатр у Рызе / Кастусёнак // Беларус. шк. у Латвіі. – 1928. – № 8. – С. 119–129.

3. Культурная хроніка // Беларус. крыніца. – 1933. – № 26. – С. 3.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 459. Воп. 1. Спр. 55.
5. Прысутны. Сьвяткаваньне Коласаўскага Юбілею Скарынінскім Т-вам у Празе / Прысутны // Сялян. ніва. – 1927. – № 2. – С. 5.
6. Угодкі Усебеларускага Зьезду // Змаганьне. – 1923. – № 22. – С. 8.
7. Шабельцев, С. В. Просоветская ориентация белорусских иммигрантов из II Речи Посполитой в Аргентине (1930–1950 гг.) / С. В. Шабельцев // Изв. Гомел. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2010. – № 6. – С. 193–198.
8. Cipko, S. Ukrainians in Argentina, 1897–1950: the Making of a Community / S. Cipko. – Edmonton – Toronto : Canadian Institute of Ukrainian Studies Press, 2011. – 282 p.

УДК 94(476)«1921/1939»

# ДЗЯРЖАЎНАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

***Крывуць В. І.*** *(г. Баранавічы)*

Моладзь складала значную частку насельніцтва Заходняй Беларусі. У міжваеннай польскай дзяржаве да гэтай катэгорыі адносіліся людзі ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў уключна – першых дзесяці гадоў умоўнага працаздольнага ўзросту [12, s. 4]. Пры гэтым маладое пакаленне падзялялася тагачаснымі дэмографамі на тры асноўныя катэгорыі. Да першай адносілася даволі нешматлікая студэнцкая моладзь. Другая катэгорыя ўключала моладзь, якая навучалася ў сярэдняй школе: гімназіях, ліцэях, настаўніцкіх семінарыях і г. д. Да трэцяй – самай вялікай – катэгорыі адносілася пазашкольная моладзь, якая звычайна мела толькі пачатковую адукацыю. Гэта катэгорыя, у сваю чаргу, дзялілася на земляробчую (вясковую), рамесніцкую, рабочую моладзь, маладых чыноўнікаў [1, s. 5–6]. Што тычыцца непасрэдна Заходняй Беларусі, то, згодна з данымі афіцыйнага перапісу насельніцтва 1931 г., на яе тэрыторыі пражывалі 4 163 534 чалавекі, з іх 814 193 (19,5 %) – ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў [4, s. 44–49; 5, s. 34–37; 6, s. 40–43; 7, s. 20–21; 8, s. 16–17]. Большую частку маладога пакалення рэгіёна складала земляробчая (вясковая) моладзь.

Моладзь як важная частка грамадства не магла знаходзіцца па-за ўвагай польскіх улад, якія ў міжваенны перыяд праводзілі даволі актыўную маладзёжную палітыку на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У аснову гэтай палітыкі была пакладзена канцэпцыя дзяржаўнага выхавання. Актыўная яе рэалізацыя пачалася на мяжы 1920–1930-х гг. На думку аднаго са стваральнікаў дадзенай канцэпцыі і міністра адукацыі С. Чэрвіньскага, выхаваўчым ідэалам павінен быў стаць тып грамадзяніна-дзяржаўніка, які б адначасова з'яўляўся і байцом, і работнікам. Польскай дзяржаве быў патрэбны грамадзянін, які б «мужнай паўсядзённай працай, а пры неабходнасці і святым запалам барацьбы даказваў